пліны. Гэта абумоўлена тым, што мастацтва адлюстроўвае культурна-гістарычную сітуацыю ў цэлым і рэалізуе, акрамя пазнавальнай, яшчэ і геданістычную функцыю. Важна, што ў мастацкай культуры найбольш поўна і яскрава праяўляюцца творчыя сілы чалавека. Вывучэнне мастацкай культуры студэнтамі адкрывае шырокія магчымасці фарміравання маралі будучых спецыялістаў праз вылучэнне і творчае ўвасабленне універсальных праблем, якія маюць непасрэдныя адносіны да кожнага чалавека, такіх як сэнс жыцця і шчасця, дабро і зло, любоў і нянавісць, сумленне, віна і адказнасць і інш.

Неабходна таксама адзначыць, што мастацкая культура з'яўляецца часткай, дакладней падсістэмай, культуры, сярэдзінным яе пластом, дзе духоўнае і матэрыяльнае, унутранае і знешняе, змест і форма выступаюць у пэўнай, хоць і вельмі рухомай раўнавазе. Мастацкая культура – гэта, як вядома, мастацтва, якое ў сваю чаргу складаецца з паасобных канкрэтных відаў, жанраў. У сувязі з гэтым студэнты, вывучаючы музыку, выяўленчае мастацтва, тэатр, архітэктуру, кіно, пашыраюць культуралагічную прастору, паглыбляюць веды аб культуры як цэласнай сістэме.

**І.М.Стрыжонак**, *ст.выкладчык*

# УЗАЕМАСУВЯЗЬ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА З САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ МІЖПРАДМЕТНАГА МЫСЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ

Сучаснае сацыякультурнае становішча характарызуецца інтэгратыўнымі тэндэнцыямі ў навуцы і адукацыі. Інтэграцыя навук забяспечваецца адзінствам аб'екта і метадаў даследавання, паняційнага апарату. Агульным аб'ектам выступае сацыякуль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турная сфера дзейнасці, скіраваная на паляпшэнне засваення каштоўнасцей культуры з дапамогай спецыяльных метадаў.

Пашырэнне інфармацыйнасці грамадства садзейнічае ўзрастанню ролі інфармацыйна-бібліятэчных дысцыплін у прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў любога профілю дзейнасці, асабліва работнікаў бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Бібліятэказнаўства як адна з асноўных дысцыплін бібліятэказнаўчага цыкла забяспечвае фундаментальную метадалагічную і агульнатэарэтычную падрыхтоўку спецыялістаў. У працэсе вывучэння курса студэнты павінны набыць шэраг ведаў, навыкаў і ўяўленняў, у тым ліку і аб узаемадзеянні бібліятэказнаўства з іншымі навукамі.

Бібліятэказнаўства не існуе ізалявана, адасоблена ад іншых навуковых дысцыплін. Будучы самастойнай навукай, яно мае цесныя міжнавуковыя сувязі, пры неабходнасці выкарыстоўвае паняцці, тэорыі, практыкі, метады, фактычны матэрыял іншых навук.

У працэсе выкладання курса разглядаюцца ўзроўні ўзаемадзеяння бібліятэказнаўства як з дысцыплінамі бібліятэчна-бібліяграфічнага і інфармацыйнага цыклаў, так і з агульнанавуковымі дысцыплінамі, у тым ліку з сацыяльна-гуманітарнымі. Так, бібліятэказнаўства цесна звязана з культуралогіяй, што даследуе законы развіцця духоўнай культуры як складанай грамадскай з'явы. З улікам агульных палажэнняў культуралогіі бібліятэказнаўства даследуе заканамернасці бібліятэчнай тэорыі і практыкі як састаўной часткі культурнага жыцця грамадства. Акрамя таго, даныя бібліятэказнаўства з'яўляюцца адной з крыніц фактычнай і тэарэтычнай інфармацыі аб бібліятэчнай справе як галіне культуры.

Метадалагічнай базай бібліятэказнаўства з'яўляецца філасофія. Гэта навука распрацоўвае агульныя законы развіцця грамадства і мыслення. Распрацоўка праблем бібліятэчнай справы на падставе законаў і катэгорый філасофіі ўздымае агульнатэарэтычны ўзровень бібліятказнаўства, умацоўвае яго пазіцыі як навукі.

Сацыялогія дае бібліятэказнаўству важны інструментарый для вывучэння чытачоў і на гэтай аснове дапамагае распрацоўцы шляхоў удасканалення бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва. Актыўна выкарыстоўвае бібліятэказнаўства тэорыю і методыку сацыяльнай псіхалогіі, асабліва анкетаванне, групавы эксперымент. Цесныя ўзаемасувязі бібліятэказнаўства з іншымі навукамі дазволілі вылучыць у яго структуры такі новы самастойны падраздзел, як бібліятэчная сацыялогія, якая вывучае сацыялогію бібліятэкі, кнігі, чытання, сацыяльныя фактары функцыянавання ў грамадстве дакументаў, ведаў, інфармацыі. Сацыялагічны аналіз функцыянавання бібліятэкі і бібліятэчнай справы дазваляе вызначыць сутнасць чытацкіх інтарэсаў і патрэб, іх характар і накіраванасць; вызначае месца чытання ў сістэме грамадскіх з'яў і яго ролю ў фарміраванні духоўнага свету чалавека. Са свайго боку сацыялогія ўлічвае даныя бібліятэказнаўства аб чытанні пры сацыяльнай характарыстыцы грамадства і яго асобных слаёў.

Сёння актыўна развіваюцца ўзаемасувязі бібліятэказнаўства з эканамічнай навукай, фарміруецца праблематыка эканомікі бібліятэчнай справы. Бібліятэказнаўства даследуе такія пытанні, як эканамічная ацэнка працы, аспекты выкарыстання бібліятэчных паслуг, фінансаванне і аплата працы ў бібліятэчнай справе, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне бібліятэк і інш. Узнік новы напрамак даследавання – бібліятэчны маркетынг.

Неабходна падкрэсліць і педагагічную накіраванасць бібліятэказнаўства, якое актыўна выкарыстоўвае пэўныя тэарэтычныя палажэнні і прынцыпы педагогікі, што ўплываюць на такі раздзел бібліятэказнаўства, як бібліятэчнае абслугоўванне.

Вынікам творчай асіміляцыі бібліятэказнаўствам педагагічных навуковых ведаў з'явілася выдзяленне ў структуры навукі бібліятэчнай педагогікі, якая вывучае педагагічныя асновы бібліятэчна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай работы з чытачамі. У сваю чаргу педагогіка выкарыстоўвае даныя бібліятэказнаўства аб пазашкольным чытанні, выхаванні культуры чытання, успрыманні бібліятэкі як фактару выхавання і навучання дзяцей і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цесная ўзаемасувязь з псіхалогіяй абумоўлена тым, што бібліятэказнаўства выкарыстоўвае даныя агульнай псіхалогіі (узроставай псіхалогіі, педагагічнай псіхалогіі, псіхалогіі працы і інжынернай псіхалогіі). Для бібліятэказнаўства актуальна вучэнне аб псіхалагічных працэсах і якасцях асобы, яе індывідуальна-тыпалагічных асаблівасцях. Вынікам інтэграцыі бібліятэказнаўства з псіхалогіяй з'явілася бібліятэчная псіхалогія як прыватны падраздзел бібліятэказнаўства, які вывучае псіхалагічныя асновы бібліятэчнай справы.

Уяўленне аб міжпрадметным характары бібліятэказнаўства, яго сувязях, інтэграцыі з шэрагам дысцыплін сацыяльна-гуманітарнай сферы студэнты атрымліваюць у працэсе вывучэння курса "Бібліятэказнаўства: тэорыя". Лекцыя, прысвечаная статуту бібліятэказнаўства, яго становішчу ў сістэме навуковых ведаў, падрабязная характарыстыка ўзаемасувязей яго з іншымі навуковымі дысцыплінамі, уяўленне аб галоўных кірунках развіцця бібліятэказнаўства і шляхах бібліятэказнаўчых даследаванняў садзейнічаюць больш глыбокаму разуменню сутнасці бібліятэказнаўства як навукі і характару бібліятэказнаўчых даследаванняў. У працэсе самастойнай работы па тэме, працуючы з шэрагам крыніц, студэнты маюць магчымасць засвоіць асноўныя палажэнні псіхалогіі, педагогікі і іншых сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, асэнсаваць шляхі ўзаемадзеяння і інтэграцыі бібліятэказнаўства з гэтымі навукамі.

На семінарскіх занятках па тэме «Узаемадзеянне бібліятэказнаўства з іншымі навуковымі дысцыплінамі» выкладчык звяртае ўвагу студэнтаў на ўзаемасувязь розных галін навукі; аналізуюцца існуючыя сувязі; адзначаецца, што інтэграцыя бібліятэказнаўства, у тым ліку з сацыяльна-гуманітарнымі дысцыплінамі, выяўляецца асабліва яскрава ў арганізацыі комплексных навуковых даследаванняў, у якіх удзельнічаюць бібліятэказнаўцы і прадстаўнікі іншых дысцыплін. Правядзенне розных відаў заняткаў па курсе, самастойная работа студэнтаў садзейнічаюць фарміраванню міжпрадметнага мыслення студэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таў фарміраванню ў іх адзінага сэнсавага поля ў адносінах да комплексу прафесійных паняццяў, развіццю цэласнага бачання свету і разумення месца ў ім сваёй прафесіі.

**Э.С.Суддзя,** *дацэнт*

## МЕТАДЫ ПЕРАДАЧЫ ВЕДАЎ ПА ГАЛІНОВЫХ КУРСАХ У ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭКАРАЎ-БІБЛЁГРАФАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ

Набыццё студэнтамі прафесіяналізму важнае не столькі ў сэнсе засваення ведаў, колькі ў развіцці творчых здольнасцей, павышэнні ўвагі да ўсяго перадавога, фарміраванні ініцыятыўнасці, якая грунтуецца на высокай інтэлектуальнай культуры. Вырашэнне такой складанай задачы немагчыма без комплексу разнастайных метадаў навучання.

Мы спынімся толькі на тых, якія выкарыстоўваем пры вывучэнні курса «Бібліяграфія мастацкай літаратуры, літаратуразнаўства і мастацтва» і якія, як мы пераканаліся ў працэсе выкладання, адпавядаюць канцэпцыі развіваючага навучання.

Эксперыментальныя даследаванні ў галіне педагагічнай псіхалогіі Г.С.Касцюк, У.У.Давыдава, Дз.Б.Эльконіна і іншых паказалі вызначальную ролю тэарэтычных ведаў ужо на пачатковым этапе навучання. Таму вялікае значэнне набываюць тыя метады, якія накіраваны на развіццё ў студэнтаў здольнасці да абагульнення. Напрыклад, яна можа фарміравацца ў ходзе абагульненага распазнавання малазнаёмых аб’ектаў у мастацтве і літаратуры ў крыніцазнаўчых тэмах курса, пры асэнсаванні маральных якасцей персанажаў падчас чытання мастацкай літаратуры і яе анатавання, пры вывучэнні класіфікацыі бібліяграфічнай прадукцыі, авалодання разумовымі аперацыямі (параўнанне, аналіз, сінтэз) праслухоўвання лекцый і пры ўдзеле ў семінарскіх занятках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ